Салаўёў Н.

# КРЫЛАТЫ СОКАЛ

Уладзімір Скугар, ураджэнец вёскі Жабыкі Касцюковіцкага раёна, у 1935 годзе стаў курсантам Ейскага вучылішча лётчыкаў. Пасланы ён быў на вучобу па камсамольскай пуцёўцы, і ў 1938 годзе, паспяхова закончыўшы вучылішча, стаў лётчыкам у адным з палкоў ваенна-паветраных сіл Чарнаморскага флота. У складзе гэтага палка Скугар і сустрэў пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

Лётчыкаў палка ўзнялі па трывозе сярод ночы. Дзесьці ў баку, там, дзе раскінуўся Севастопаль, грымелі выбухі.

Так пачаліся цяжкія будні вайны. Уладзімір Скугар вадзіў свой бамбардзіроўшчык СБ на выкананне баявых заданняў. Яму даводзілася ў сорак першым годзе бамбіць варожыя аб'екты ў Галацэ, Канстанцы, Тульчыне і ў іншых тылавых гарадах праціўніка. Вадзіў свій самалёт і над прасторамі Чорнага мора. Адзін з такіх палётаў мог закончыцца катастрофай, але вытрымка, уменне, майстэрства і самавалоданне выратавалі жыццё экіпажу бамбардзіроўшчыка.

Самалёт ішоў на заданне. Ляцелі над морам. Калі да цэлі заставалася некалькі мінут палёту, з боку Румыніі нечакана паявілася 6 варожых знішчальнікаў. Яны заўважылі адзінокі бамбардзіроўшчык, пайшлі на зближэяне. З ходу атакаваўшы самалёт Скугара, ворагі адкрылі моцны агонь па машыне. Уступаць з імі ў бой лётчык не мог, сілы былі няроўныя; на ціхаходнай, непаваротлівай машыне цяжка было спадзявацца на поспех. Таму Скугар прыняў адзіна правільнае рашэнне. Ён кінуў самалёт уніз і на брыючым палёце стаў уходзіць к свайму берагу. Гэта і выратавала лётчыкаў. Знізу варожыя знішчальнікі не змаглі падабрацца к бамбардзіроўшчыку, а зверху зайсці ў хвост ім не даваў стралок-радыст, які вёў агонь і трымаў фашыстаў на адлегласці ад машыны.

Да свайго берагу заставалася ўжо нямнога, і Скугар павялічыў абароты матораў. Ён чуў кароткія чэргі кулямёта, але раптам кулямёт змоўк. Лётчык азірнуўся і ўбачыў, што стралок-радыст заваліўся на бок і акрываўленыя яго рукі спаўзаюць з рукаятак кулямёта. "Паранен", – падумаў Скугар, да максімуму фарсіруючы маторы.

Ворагі, выкарыстаўшы раненне стралка-радыста, населі на безабаронную машыну. Задыміў правы матор, у самалёце паявіліся прабоіны. Скугар яшчэ ніжэй спусціўся к вадзе, ведаючы. што ў гэтым цяпер яго выратаванне. Зямля набліжалася, самалёт ішоў к берагу. Лётчык вёў яго разлікова, цвёрда трымаў штурвал. Скугару ўдалося пасадзіць пашкоджаны бамбардзіроўшчык на нашай тэрыторыі, вынесці стралка-радыста. Але выратаваць машыну ён не змог.

Нядоўга давялося быць Скугару без самалёта. Атрымаўшы новы, на гэты раз пікіруючы бамбардзіроўшчык ПЕ-2, ён стаў вадзіць яго на

разведвальныя палёты, на бамбардзіроўку варожай абароны, жывой сілы і тэхнікі. Удзельнічаючы ў абароне Адэсы, Севастопаля, лётчык толькі ў грозным сорак першым годзе знішчыў са сваім экіпажам 44 танкі, 42 аўтамашыны, 25 гармат, патапіў у Чорным моры варожы манітор. Гэта быў важкі ўклад у справу разгрому ворага, і камандаванне ўзнагародзіла лётчыка ордэнам Чырвонага Сцяга.

Уладзімір Скугар служыў у разведвальным авіяцыйным палку Чарнаморскага флота. Яго асноўнай работай, баявой работай, стала разведка варожых аб’ектаў у тыле, абарончых рубяжоў. Лятаць на заданні даводзілася ў адзіночку, а гэта заўсёды было звязана з цяжкасцямі і вялікай рызыкай – варожыя лётчыкі цэлымі чародамі накіраваліся на такія самалёты. Над аб’ектам, які трэба было разведаць і сфатаграфаваць, самалёт сустрэў шчыльны агонь зенітнай артылерыі, праз які неабходна было прабіцца і выканаць баявое заданне.

Паявіўшыся над зададзеным раёнам, пралятаючы над цэллю, Скугар, як правіла, зніжаўся на 400-500 метраў і вёў свой самалёт у моры шчыльнага агню і выбухаў зенітных снарадаў. Праводзячы аэрафотаздымкі, лётчык заўважаў усё, што робіцца на зямлі, і пры вяртанні на свій аэрадром падрабязна дакладваў аб гэтым начальству. Па дадзеных Скугара і іншых распрацоўваўся план аперацыі і ў паветра ўзнімаліся штурмавікі і бамбардзіроўшчыкі. Яны наносілі ўдар па тых аб’ектах, якія былі выяўлены ў час разведвальных палётаў.

Нашаму земляку давялося пазнаць усю горыч адступлення. Пасля таго, як нашы войскі пакінулі Адэсу, ён абараняў у небе Севастопаль. А калі і гэта чарнаморская цвярдыня была пакінута па загаду Стаўкі, Скугар змагаўся над Каўказам і ўсё марыў аб тым, калі ён і яго таварышы пасадзяць свае баявыя машыны ў вызваленым Севастопалі. І ён рабіў ўсё магчымае, каб наблізіць гэты дзень, каб паскорыць разгром ворага, засеўшага ў Крыму.

З пачатку сорак чацвёртага года многа раз даводзілася Уладзіміру Скугару вадзіць свой самалёт над Крымам. Ён лятаў над гарадамі і портамі, фатаграфаваў рубяжы абароны, узводзімыя ўмацаванні, сканцэнтраваныя ў портах караблі. Калі пачаліся вясной баі за вызваленне Крыма, Скугару больш за, ўсё даводзілася вылятаць к Севастопалю – камандаванню кожны дзень патрэбны былі дакладныя дадзеныя аб становішчы горада, аб сканцэнтраваных там сілах і рубяжах абароны.

У той цёплы сакавіцкі дзень 1944 года Уладзімір Скугар вёў свой ПЕ-2 к Севастопалю. Праляцеўшы над Ялтай, ён павярнуў самалёт на захад, каб дакладна выйсці к акваторыі Севастопаля, разведаць там абстаноўку і сфатаграфаваць сканцэнтраваныя ля горада варожыя караблі.

К гораду падышлі з боку мора. У вочы яшчэ здалёк кінулася вялікая колькасць караблёў, стаяўшых ля прычалаў і на якарах у заліве. Экіпаж падлічыў іх. Выявілася 26 суднаў і транспартаў.

– Фатаграфіруй адразу, – загадаў Скўгар штурману.

Штурман стаў выконваць загад камандзіра, а стралок-радыст сачыў за паветрам.

– З поўначы ідзе дзесяць "месераў!" – далажыў ён Скугару.

– Трэба паспець да іх падыходу закончыць фатаграфаванне, – сказаў капітан штурману.

– Зраблю, – адказаў той, і Скугар спакойна вёў самалёт, ведаючы, што штурман не падвядзе.

Самалёты праціўніка набліжаліся. Яны ўжо сталі перастройвацца ў баявы парадак. Але тут штурман далажыў:

– Заданне выканана.

– Уходзім, – сказаў Скугар. – У бой не ўвязваемся.

Крута развярнуўшыся, самалёт лёг на зваротны курс. Сталі ўходзіць у бок адкрытага мора.

– Дзе "месеры"? спытаў капітан у стралка-радыста.

– Адсталі, – адказаў той і праз мінуту дадаў:

– Павярнулі назад.

– Рашылі, што нас прагналі.

Праз паўгадзіны ПЕ-2 прызямліўся на аэрадроме. Атрыманыя звесткі тут жа былі перададзены камандаванню. У паветра ўзняліся штурмавікі і бамбардзіроўшчыкі. Услед за імі ўзляцелі тарпеданосцы.

Нашы лётчыкі так знянацку паявіліся над акваторыяй Севастопаля, што вораг нічога не змог прадпрыняць. Усе стаяўшыя на рэйдзе судны і транспарт былі знішчаны бомбамі і тарпедамі.

16 мая 1944 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў асабліва адзначыўшымся байцам і камандзірам, удзельнічаючым у баях за вызваленне Крыма, званне Героя Савецкага Саюза. Гэтага ганаровага звання быў удастоен і намеснік камандзіра эскадрыллі капітан Скугар Уладзімір Антонавіч. На яго грудзях побач з двума ордэнамі Чырвонага Сцяга і ордэнам Чырвонай Зоркі заззялі ордэн Леніна і Залатая Зорка Героя.

Пасля Перамогі Уладзімір Скугар працягваў службу ў авіяцыі. Ён вучыў маладых лётчыкаў, перадаваў ім баявы вопыт часоў Вялікай Айчыннай вайны. У 1960 годзе Уладзімір Антонавіч звольніўся ў запас і пасяліўся ў Крыму, за які яму давялося змагацца ў 1941 і 1944 гадах. Цяпер палкоўнік запаса Скугар У. А. жыве ў горадзе Сімферопалі, актыўна ўдзельнічае ў правядзенні ваенна-патрыятычнай работы, часта выступае перад моладдзю з расказамі аб гераізме савецкіх лётчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Салаўёў, Н. Крылаты сокал / Н. Салаўёў // Сцяг камунізма (Касцюковічы). — 1975. — 9 мая. — С. 2—3.**